


*Энцыклапедыя «Археалогія і нумізматыка Беларусі».*

адведзена біягр. артыкулам пра вучоных і даследчыкаў — археолагаў, гісторыкаў, краязнаўцаў і мастацтвазнаўцаў Беларусі, Украіны і Расіі, якія ўнеслі значны ўклад у развіццё археал. навукі ў Беларусі. Выданне праілюстравана каляровымі і чорна-белымі фотаздымкамі, малюнкамі, картамі і планамі распаўсюджвання асобных культур. Разлічана на выкладчыкаў і студэнтаў гуманітарных ф-таў ВНУ, настаўнікаў сярэдніх школ і ўсіх, хто цікавіцца гіст. мінулым Беларусі.

**«АРХЕАЛО́ГІЯ І НУМІЗМА́ТЫКА БЕЛАРУ́СІ»**, аднатомная галіновая энцыклапедыя. Падрыхтавана і выдадзена ў Мінску ў 1993 выд-вам «Беларуская Энцыклапедыя імя П.Броўкі». Мэта выдання — пазнаёміць чытача з помнікамі археалогіі і нумізматыкі Беларусі, адкрыццямі навукоўцаў за апошнія 250 гадоў. У выданні змешчаны 2384 артыкулы (з іх 419 па нумізматыцы), яно праілюстравана вял. колькасцю каляровых і чорна-белых здымкаў, планаў і схем асобных помнікаў. У артыкулах па археалогіі апісваюцца ўсе археал. культуры, якія існавалі на тэр. Беларусі, усе тыпы археал. помнікаў (стаянкі, паселішчы, гарадзішчы, селішчы, могільнікі, свяцілішчы і інш.), а таксама помнікі архітэктуры сярэдневякоўя (мураваныя храмы, замкі, палацы), рэчы матэрыяльнай культуры і унікальныя творы першабытнага мастацтва. У артыкулах па нумізматыцы прадстаўлена грунтоўная інфармацыя па ўсіх аспектах манетнай справы. У стварэнні энцыклапедыі прымалі ўдзел вядучыя бел. вучоныя-археолагі, нумізматы, гісторыкі, краязнаўцы, мастацтвазнаўцы і інш. Выданне разлічана на выкладчыкаў і студэнтаў гуманітарных ф-таў ВНУ, настаўнікаў сярэдніх школ і ўсіх, хто цікавіцца далёкім мінулым Беларусі.

*А.А.Трусаў.*

**АРХЕТЫ́П** (ад грэч. archē пачатак + typos вобраз), правобраз, першавобраз. У антычнай філасофіі і эстэтыцы — узор усіх рэчаў і сутнасцей, ідэя ў вобразнай форме. Паводле аналітычнай псіхалогіі К.Юнга, А. — калект. падсвядомыя вобразы, спадчынная аснова асабістых душэўных перажыванняў, якія створаны не на аснове індывід. вопыту, а перадаюцца з пакалення ў пакаленне. Выяўляюцца як міфал., рэлігійныя і маст. сімвалічныя вобразы ў мастацтве. Канкрэтызуюцца ў нац. культурах (міфалогіі, аўтэнтычнай нар. культуры, прафес. творчасці), набываюць спецыфічную для кожнага народа семантыку і сімвалічнае значэнне першаствaральнікаў культуры (дэміургаў), чарадзейных паэтаў і музыкаў, песняроў (стараж.-грэч. Арфей і Гамер, рымскія Ромул і Рэм, біблейскі Майсей і яго пераемнік Ісус Навін). Гэты працэс архетыпізацыі працягваецца і ў эпохі сучасных развітых цывілізацый, калі адбываецца міфалагізацыя творчасці славутых мастакоў, пачынальнікаў новых маст. метадаў і кірункаў. Тоесныя архетыпныя матывы і вобразы сустракаюцца ў нyродн асных культурах і сферах мастацтва, што тлумачыцца іх універсальным і пастаянным пачаткам у чалавечай прыродзе.

У бел. маст. культуры (фальклор, аўтэнтычнае дэкар.-прыкладное мастацтва, традыц. абрады і харэаграфія, нар. тэатр) самабытна выявіліся А. айчыннай і сусв. міфалогіі, біблейскія першавобразы (Сусв. Дрэва, язычніцкія божаствы). У казках, паданнях і легендах пад уплывам хрысціянства адбылася палярызацыя персанажаў на станоўчых і адмоўных герояў, увасабленняў зла і смерці. У бел. чарадзейных казках позняга паходжання (18—19 ст.) шырока выкарыстаны маст. прыёмы гратэску і травестацыі, калі ў камічных абліччах прадстаўлены гал. героі твораў (выратавальнік, культ. герой, у т.л. Бог, Хрыстос і яго апосталы). Гэтая традыцыя карнавальнага смеху паходзіла ад сярэдневяковай гратэскавай культуры і не мела дачынення да атэістычнага светапогляду.

Антычны А. чароўнага музыкі і песняра Арфея набыў значэнне сімвалу маст. генія, унушальнай і ачышчальнай функцый мастацтва. Вобраз усх.-слав. чароўнага песняра і музыкі стварыў невядомы аўтар сярэдневяковай паэмы «Слова аб палку Ігаравым» («Слово о пълку Игореве...», 2-я пал. 12 ст.), якая, на думку асобных даследчыкаў, магла быць напісана ў Полацкім або Мінскім княствах. Зближаныя паміж сабой антычны А. чароўнага музыкі і евангельскі А. Лазара беднага і яго багатага брата шматгранна выявіліся ў бел. фальклоры (з цыкла чарадзейных казак «Чароўная дудка», запісаная А.Сержпутоўскім у канцы 19 — пач. 20 ст., казка «Музыка» і травестацыя гэтага сюжэту ў казцы «Цыган-музыка»). Вобраз музыкі-выратавальніка, які разбурыў Пекла (сімвал смерці), заняў цэнтр. месца ў новай бел. л-ры (лірычнай і эпічнай паэзіі, драматургіі Я.Купалы). На этапах яе станаўлення і класічнага сінтэзу А. чароўнага музыкі пазначаны назвамі асобных твораў («Зайграй, зайграй, хлопча малы...» П.Багрыма, верш «Не я пяю — народ Божы...», паэмы «Лірнік вясковы» У.Сыракомлі, «Гусляр» Я.Купалы, «Сымон-музыка» Я.Коласа і інш.), загалоўкамі з паэт. зб-каў «Дудар беларускі» В.Дуніна-Мар-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ